# ИСТОРИЯ

УДК 726.7.03 (476.5-21)

## СТРАЧАНАЯ АРХІТЭКТУРНАЯ СПАДЧЫНА ПОЛАЦКА: ГІСТАРЫЧНЫ ЛЁС БАРЫСАГЛЕБСКАГА МАНАСТЫРА

*Ю.А. БАРАНАВА*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Разглядаецца гісторыя страчанага Барысаглебскага (Бельчыцкага) манастыра - адной з самых старажытных полацкіх абіцеляў, лёс якой ад заснавання ў XII ст. да знікнення ў пачатку XX ст. належыць да найболыи цікавых і трагічных старонак мінулага Полаччыны.*

Адной з важных частак культурнай спадчыны кожнага народа з'яўляецца манументальнае дойлідства. Са старажытных часоў колькасць помнікаў культавай архітэктуры сведчыла аб ступені эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурна-рэлігійнага развіцця горада. У XI - XIII стст. па дадзеных летапісных крыніц на тэрыторыі старажытнай Русі налічвалася каля сямідзесяці манастырскіх абіцеляў, тры з іх знаходзіліся ў Полацку [1, с. 156]. Значнай была таксама колькасць полацкіх храмаў, якая ў XII ст. дасягала пяці [2, с. 76]. Багатая самабытная архітэктурная спадчына адлюстроўвала высокую ступень развіцця хрысціянскай традыцыі на Полаччыне, сведчыла аб яе палітычнай і культурнай самастойнасці, дазваляла паставіць у адзіны шэраг з найболыи моцнымі і развітымі княствамі старажытнай Русі - Кіевам, Ноўгарадам, Смаленскам [1, с. 156].

На працягу амапь усёй гісторыі Беларусі архітэктурныя помнікі знішчаліся, асабліва пацярпелі храмы. Прычынай гэтаму былі шматлікія палітычныя, эканамічныя, рэлігійна-канфесійныя і культурныя катаклізмы, якія перажывала краіна на шляху свайго гістарычнага развіцця. Страта каштоўнейшай нацыянальнай спадчыны неаднаразова з'яўлялася вынікам ідэалагічнай барацьбы ў грамадстве, адсутнасці ў беларусаў адзінства веравызнання, а часам атэістычнага вандалізму, прафесійнай некампетэнтнасці ці проста безгаспадарчасці. Між тым, за кожнай з разбураных Святынь стаіць цікавая гісторыя, выдатны архітэктурна-мастацкі вобраз, важная сацыяльна-асветніцкая функцыя.

Лёс разбурэння і забыцця напаткаў шматлікія храмы Полаччыны, сярод іх Барысаглебскі (Бельчыцкі) манастыр - адна са старажытнейшых абіцеляў горада, якая не адно стагоддзе з'яўлялася цэнтрам духоўнага і культурна-рэлігійнага жыцця і ўяўляла сабою буйнейшы архітэктурны комплекс помнікаў праваслаўнага манументальнага культавага дойлідства XII ст.

Полацкі манастыр Барыса і Глеба, у склад якога ўваходзілі чатыры храмы: Барысаглебская царква, царква Св. Параскевіі Пятніцы, Вялікі (безыменны) сабор, храм-трыконх, знаходзіўся на левым беразе Заходняй Дзвіны ў паўкіламетры ад вусця ракі Бельчыцы (Бяльчанкі), таму ў старажытнасці яго часта называл! Бельчыцкім [3, с. 7]. Тэрыторыя манастыра з'яўлялася месцам актыўнага жыцця і шчыльнай заселенасці ў раннефеадальны перыяд Полацкага княства (XII ст.). Археолагі А.М. Ляўданскі і С.А. Дубінскі, праводзячы ў 1928 г. раскопкі, выявілі, што вакол храмаў манастыра меліся рэшткі селішчаў, якія былі ўтвораны не раней за пабудову абіцелі. Акрамя таго, у раёне Бельчыцы даследчыкамі быў знойдзены курганны могільнік крывічоў, насыпаны на месцы селішча сярэдзіны першага тысячагоддзя да н.э. [4, с. 84]. У сучаснай структуры г. Полацка тэрыторыя былой праваслаўнай абіцелі, што доўгі час насіла назву «Бельчыцкая слабада», занята будынкамі жылых дамоў мікрараёна па вуліцы Юбілейнай і завулку Юбілейнаму [5, с. 351; 6, т. 2, с. 11].

Дакладна вызначыць час заснавання Бельчыцкай абіцелі складана, існуе некапькі пparticular поглядаў даследчыкаў на гэтую праблему. Так, напрыклад, польскі гісторык-храніст М. Стрыйкоўскі ў канцы XVI ст. меркаваў, што храмы манастыра былі закладзены ў 1117 г., а канчаткова пабудаваны ў 1122 г. полацкім князем Барысам Гінвілавічам [3, с. 182].

Даследчык XIX ст. А.М. Семянтоўскі падзяляў меркаванне М. Стрыйкоўскага адносна асобы заснавальніка манастыра - унука літоўскага князя Мінгайлы, полацкага князя Барыса Гінвілавіча, аднак пазначаў больш позні час заснавання - 1190 г. [7, с. 43].

У хроніцы Быхаўца прадстаўлена іншая версія паходжання Бельчыцкага манастыра, па якой князь Гінвіл, названы пры хрышчэнні Юры, пакінуў сваім спадкаемцам у Полацку сына Барыса, які і пабудаваў Барысаглебскую царкву [8, с. 4]. Згодна з гэтай версіяй, храм павінен быў быць заснаваны ў XII ст., а князем Барысам-Гінвілам, магчыма, з'яўляўся полацкі князь Барыс Усяслававіч, які памёр у 1128 г. А. Сапуноў у сваёй працы «Рака Заходняя Дзвіна» (1893 г.) таксама адносіў час пабудовы Бельчыцкіх храмаў да 1128 г., што сведчыла аб магчымым выкарыстанні ім у якасці гістарычнай крыніцы менавіта хронікі Быхаўца XVI ст. [9, с. 421].

Гісторык другой паловы XIX ст. В.Е. Данілевіч пазначаў: «в 1159 г. упоминается в источниках пригородное село Бельчица. К периоду до конца XIII века относится основание здесь Борисо-Глебского монастыря» [10, с. 16].

Іпацьеўскі летапіс утрымлівае звесткі аб тым, што літоўскі князь Мінгайла ўладарыў некаторы час Полацкам, «оставил по себе двух сынов своих одного Скирмонта, а другого Кгинвила (Гинвила) и Скирмонт почнеть княжити на Новгородцы, а Кгинвил на Полоцку, и поиметь Кгинвил дочку князя тверского Бориса именем Марья, для которое окрестился в русскую веру и дали ему имя Борис, он поставил церковь монастырь на Бельчицы Святога Бориса и Глеба» [8, с. 3]. На аснове прыведзеных летапісных дадзеных заснаванне абіцелі трэба адносіць да пачатку XIII ст. [8, с. 3]. Такое ж меркаванне выказвалі даследчыкі 20 - 30-х гг. XX ст. М.М. Шчакаціхін і М.М. Варонін, бо, на іх думку, для полацкага дойлідства больш ранняга перыяду (першай паловы XII ст.) не былі характэрны аднаапсідныя канструкцыі культавых пабудоў, што назіралася ў Бельчыцкіх храмах [8, с. 9].

Такія агульныя рысы Барысаглебскага і Спаса-Ефрасіннеўскага манастыроў, як падабенства ў характеры размяшчэння на мясцовасці, блізкасць архітэктуры і ўнутранай структуры храмавых пабудоў, далі магчымасць сучасным даследчыкам адносіць узвядзенне абодвух абіцеляў да XII ст. Сёння гэты факту большасці айчынных гісторыкаў і археолагаў не выклікае сумнення [2, с. 78].

Старажытныя Бельчыцкі і Спаскі манастыры, выконваючы адзіную рэлігійную функцыю, мелі розныя сацыяльныя функцыі. Сгіаскі жаночы манастыр у XII ст. з'яўляўся аплотам полацкага епіскапства. У той час як Барысаглебскі быў апірышчам княжацкай улады [2, с. 79]. Мясцовасць Бельчыцы ўпершыню ўпаміналася ў Іпацьеўскім летапісе пад 1159 г. у сувязі з барацьбой паміж полацкімі гараджанамі і князем Расціславам Глебавічам [11, с. 198; 12, с. 28]. Калі ў горадзе ўзнікла змова супраць князя і пачалося збіццё яго дружыны, Расціслаў з часткай свайго атачэння знаходзіўся ва ўмацаванай Бельчыцкай абіцелі, аб чым летапісец пазначаў: «...бяшеть бо князь в то время на Бельцици» [6, с. 11]. Па сведчаннях гісторыка М. Стрыйкоўскага, Барысаглебскі манастыр у старажытнасці быў абнесены каменнай сцяной, над якой у шматлікіх месцах узвышаліся вежы і байніцы, такім чынам утваралася крэпасць, дзе яшчэ ў часы Уладзіміра, знаходзіліся княжацкія церамы [13, с. 37].

Даследаванні археолага і краязнаўцы І.П. Дэйніса, праведзеныя ў 20 - 30-х гг. XX ст., пацвердзілі думку аб размяшчэнні Бельчыцкага манастыра побач з палацамі, дзе жылі князі ў перыяд вечавога праўлення ў Полацку. Магчыма, манастыр і рэзідэнцыя князёў складалі адзінае цэлае, бо Барысаглебская абіцель у XII ст. была самая вялікая ў Полацку, нават Верхні Замак у той час саступаў ёй па ліку мураваных каменных пабудоў [14, ф. 1164, воп. 1, спр. 11, а. 49].

Перанос рэзідэнцыі князёў у Бельчыцы быў абумоўлены ўзрастаючай у XII ст. роляй Полацкага веча. Князь Барыс размясціў рэзідэнцыю на левым беразе Заходняй Дзвіны, каб проціпаставіць сваю ўладу вечавому баярству, месцам канцэнтрацыі якога з'яўляўся Верхні Замак - гістарычны цэнтр Полацка [2, с. 79]. Аб рэальнай пагрозе полацкім князям з боку баяр можна меркаваць па такому факту, што з усіх замкаў і пасадаў Полацка толькі Бельчыцы былі абнесены каменнай сцяной [7, с. 37]. Археалагічныя раскопкі, праведзеныя М.М. Кайгарадавым у 1914 - 1915 гг., выявілі рэшткі падмуркаў старажытнай каменнай крэпаснай сцяны і адной з абарончых вежаў [15, с. 32]. Сцяна абмяжоўвала тэрыторыю Бельчыцкага пасаду і праходзіла ўздоўж ракі Бяльчанкі (Бельчыцы) [15, с. 32].

Такім чынам, акрамя месца размяшчэння княжацкай рэзідэнцыі, адной з галоўных функцый Бельчыцкага манастыра была ваенная абарона подступаў да горада і абвяшчэнне аб набліжэнні ворага. Для выканання функцыі фарпоста Барысаглебская абіцель мела візуальную сігнальную сувязь з Верхнім Замкам і Спаса-Ефрасіннеўскім манастыром. Такая сігнальная сувязь існавала паміж манастырскімі храмамі, пабудаванымі на самых высокіх кропках-узвышшах, і Сафійскім саборам [2, с. 79]. Варта адзначыць, што з узвядзеннем у XVI ст. Міхайлаўскай абіцелі на Гарадцы канчаткова завяршылася фарміраванне сістэмы манастыроў вакол Полацка, у якой Бельчыцкі адыгрываў адну з важнейшых роляў. Манастыры за межамі горада размяшчаліся па баках свету: Барысаглебскі - на ўсходзе, Міхайлаўскі - на захадзе, Спаскі - на поўначы, Іаана Прадцечы - на поўдні. Усе яны былі ў межах візуальнай бачнасці з Верхняга замка ці Сафійскага сабора. Акрамя таго, манастыры размяшчаліся на асноўных дарогах, якія вялі да Полацка. Бельчыцкі - на сучасным Мінска-Лепельскім напрамку, Міхайлаўскі - на Асвейскім, Спаскі - на Невельскім, у выніку чаго ажыццяўлялася абарончая ахова падыходаў да горада [2, с. 79].

Барысаглебскі манастыр, заснаваны як аплот княжаскай улады ў Полацку, быў надзелены Барысам Гінвілавічам (Усяслававічам) рознымі падараваннямі ў выглядзе зямлі, населеных пунктаў, гаспадарчых пабудоў [13, с. 37]. Дакументаў XII - XIII стст., што пацвердзілі б гэта, не захавалася. Існуюць звесткі аб грамаце полацкага князя Яраслава Ізяслававіча, што была нададзена ў 1396 г. Барысаглебскаму манастыру па хадатайніцтву яго ігумена, архімандрыта Філарэта. Гэтая грамата пацвярджала правы на пабудову манахамі млына на беразе ракі Бельчыцы і валоданне землямі, што ляжалі па берагах гэтай ракі [16, т. 1, с. 66; 16, т. 3, с. 175].

Да захопу Полацка ў лютым 1563 г. Іванам IV Жахлівым Барысаглебскі манастыр з'яўляўся адным з буйнейшых зямельных уладальнікаў у Полацку [5, с. 81]. Аб гэтым сведчаць дадзеныя манастырскіх інвентароў сярэдзіны XVI ст., па якіх абіцелі належылі наступныя валасці: Турэц, Суя, Усвяціца, Доўгае, Саннікі, Пустынкі, Бельчыца, Кулакова, Шчылкава, Белае, Межна, Струганы, Паўлёнкава, Пяскі, Корманы,

Звонне, Царкоўна і іншыя [11, с. 37]. Па матэрыялах Полацкай рэвізіі 1552 г., Барысаглебскаму манастыру ў 1483 г. была нададзена ва ўладанне князямі Паўлам і Міхалам Сакалінскімі воласць Урад, 34 селяніна з якой павінны былі ахвяраваць на ўтрыманне абіцелі кожны чацвёрты сноп ураджаю збожжа і палову мёда з борцяў [16, т. 4, с. 213]. На такіх жа ўмовах утрымлівалі манастыр 33 дыма ў вёсках Усвяціца і Крупніды, 19 дымоў у Пустынках, 3 - у Санніках [17, с. 176 - 177]. Воласць Доўгае з сямі прыгонных службаў і 26 дымоў выдаткоўвала штогод 10 пудоў мёда і 18 коп грошаў [17, с. 176]. Акрамя таго, панамі Корсакамі Барысаглебскай абіцелі былі нададзены 92 полацкіх мяшчаніна, 33 з якіх жылі на прылеглых да Бельчыцкай слабады землях і штогод плацілі ў манастырскі скарб 27 коп грошаў і 5 пенязяў, 56 - жылі ў пасадзе Слабоцкім і выдаткоўвалі 2 копы грошаў і 17 пенязяў, тры мяшчаніна працавалі пры самой абіцелі ў якасці наглядальнікаў за борцямі і сажалкай [17, с. 22,27, 177].

Валоданне зямельнай маёмасцю, утрыманне манастырскіх храмаў, царкоўнага кліру і чарняцоў знаходзілася першапачаткова пад уладай полацкіх князёў, якія з'яўляліся заснавальнікамі абіцелі. Пасля знікнення полацкай княжацкай дынастыі кіраванне манастыром паступова перайшло да найбольш буйных баярскіх родаў Полацка [13, с. 40]. Аднак не ўсе з іх атрымалі такое права, а толькі тыя, што раней выдаткоўвалі сродкі на ўтрыманне манастыра, ці тэта рабілі іх продкі [13, с. 40].

Сістэма кіравання манастыром была наступнай: баярскія роды, са згоды архімандрыта, абіралі з свайго асяроддзя двух манастырскіх старастаў, якія наглядалі за захаваннем маёмасці і зямельных угоддзяў абіцелі [13, с. 38].

Аднак такая выбарная сістэма была зменена на асабістую форму валодання манастыром. Тэта адбылося 28 сакавіка 1558 г., калі кароль Жыгімонт Аўгуст сваім прывілеем перадаў Полацкую архіепіскапію і Барысаглебскую архімандрыю ва ўладанне кашталяну Глебу Іванавічу Корсаку, гірадстаўніку аднаго з найбуйнейшых шляхецкіх родаў Полацка [13, с. 38]. Стаўшы полацкім архіепіскапам і паўнапраўным гаспадаром Бельчыцкай абіцелі, Г.І. Корсак, у манастве Герасім, пачаў перадаваць некаторыя манастырскія маёнткі ва ўладанне сваякам: зяцям Мікалаю Неміравічу Шчыту, князю Барысу Лукомскаму і братам з роду Корсакаў. Новыя ўладары абавязваліся ўтрымліваць манастыр на свае сродкі [13, с. 38].

У 1563 г. архіепіскап Г.І. Корсак памёр, у гэтым жа годзе Полацк быў захоплены войскамі Івана IV Жахлівага [5, с. 81]. Маскоўскі цар выдаў прадстаўнікам буйных праваслаўных полацкіх родаў (Корсакам, Шчытам, Лукомскім і інш.) новыя граматы з пацверджаннем усіх правоў на землі Бельчыцкай абіцелі [10, с. 38]. Менавіта з гэтага часу некалі буйная і багатая Барысаглебская архімандрыя пачала занепадаць - будынкі храмаў паступова прыйшлі ў паўразбураны стан, у сценах абіцелі не засталося манахаў [13, с. 38].

Пасля захопу Полацка каралём Стэфанам Баторыем у 1579 г., па яго загаду ўсе праваслаўныя манастыры і цэрквы былі перададзены ва ўладанне езуітам [5, с. 83, 86]. Барысаглебскаму манастыру ўдалося пазбегнуць канфесійных зменаў, бо Ордэну не перадаваліся «имения владычные» (архірэйскія), да якіх належыла Бельчыцкая абіцель. Такім чынам, манастыр застаўся адзіным цэнтрам праваслаўя ў Полацку.

Дзеля дакладнага ўліку ўсіх маёмасных уладанняў полацкіх цэркваў і манастыроў каралём Стэфанам Баторыем былі прызначаны спецыяльныя камісары: падскарбій Вялікага княства Літоўскага Фёдар Скумін-Тышкевіч і Віцебскі пакаморы князь Рыгор Друцкі-Сакалінскі [18, ф. 1416, воп. 6, спр. 886, а. 408]. Прызначаныя камісары выявілі незаконнасць валодання і прысвойванне прыбыткаў з маёнткаў Бельчыцкага манастыра родамі Корсакаў, Шчытаў, Лукомскіх. Тагачасны полацкі ваявода Мандвід Дарагастайскі ў 1580 г. пачаў патрабаваць вяртання абіцелі з-пад улады праваслаўных баяраў. У адказ на гэта полацкі падкаморы Анікей Корсак ад імя ўсяго роду звярнуўся да караля Стэфана Баторыя і атрымаў грамату на ўладанне манастыром без права перадачы яго прадстаўнікам іншых дынастый. У дакуменце было пазначана, што ўсе прыбыткі з манастырскіх маёнткаў павінны ісці на карысць Корсакаў, засяленне абіцелі манахамі ў грамаце не агаворвалася, таму яна доўгі час пуставала [13, с. 38]. Дзеючы ў тэты час полацкі архіепіскап Феафан Рыпінскі (1580 - 1588 гг.) знаходзіўся ў сваяцкіх сувязях з Корсакамі і некалькімі граматамі на працягу васьмі гадоў пацвердзіў іх правы на кіраванне Бельчыцкім манастыром [18, ф. 1416, воп. 6, спр. 886, а. 410]. Такую ж палітыку ў адносінах да Корсакаў праводзіў і пераемнік Ф. Рыпінскага - Афанасій Тарлецкі (1588 - 1592 гг.) [13, с. 38].

Заняўшы полацкую архіепіскапскую кафедру, Грыгоры Герман Загорскі (1596 - 1600 гг.) прызваў у 1597 г. прадстаўнікоў родаў Корсакаў, Шчытаў, Саламярэцкіх і полацкага ваяводу князя Друцкага-Сакалінскага да суда за незаконнае валоданне і прысвойванне манастырскіх прыбыткаў [7, с. 44]. Апошнія на судзе абавязаліся штогод выдаткоўваць на карысць манастыра па 30 коп грошаў, 20 бочак жыта і 25 іншага хлеба на ўтрыманне духоўных асоб, а таксама абавязваліся адрамантаваць манастырскія храмы I пабудаваць новыя келлі. Умова архіепіскапа Г.Г. Загорскага заключалася ў абавязковым насяленні Бельчыцкай абіцелі манахамі-уніятамі, бо сам Уладыка з'яўляўся прыхільнікам уніі 1596 г. [7, с. 44]. Такім чынам, Барысаглебскі манастыр стаў першай на Беларусі уніяцкай абіцеллю [13, с. 38]. Апошні фарпост праваслаўя ў Полацку быў страчаны [7, с. 44].

Пасля смерці Г.Г. Загорскага прадстаўнікі праваслаўных полацкіх родаў Корсакаў, Шчытаў, Саламярэцкіх перасталі выконваць умовы па забеспячэнню Бельчыцкага манастыра грашыма і хлебам,

яны выдалі шэраг іскавых грамат з патрабаваннем вяртання Барысаглебскай абіцелі ва ўлонне праваслаўя, бо, па іх словах: «монастырь Бориса и Глеба был учреждён предками для древней грецкой веры иноков (православных), а не для униатов» [13, с. 38]. У выніку намаганняў Корсакаў Бельчыцкая абіцель была вызвалена ад уніяцкіх манахаў і ў 1601 г. вернута да праваслаўнай канфесіі [19, с. 202].

Старажытны манастыр не доўгі час знаходзіўся ў руках праваслаўных вернікаў, становішча змянілі падзеі 1618 г., калі полацкім архіепіскапам стаў заўзяты прыхільнік уніяцтва Ясафат Кунцэвіч. Ён атрымаў ад караля Жыгімонта III асабісты прывілей на сан архімандрыта Барысаглебскага манастыра [13, с. 38]. Праваслаўныя роды Корсакаў, Шчытаў і іншых адмовіліся перадаваць абіцель ва ўладанне уніятам, яны выставілі ў байніцах умацаваных сцен манастыра гарматы і з невялікай колькасцю ўзброеных мяшчан падрыхтаваліся да аблогі [7, с. 44]. Аднак сілы былі няроўныя, Я. Кунцэвіч пры падтрымцы каралеўскага войска, што складала Полацкі гарнізон Верхняга і Ніжняга Замкаў, і вялікай колькасці ўзброеных катапікоў і уніятаў, замацаваў на супрацьлеглым манастыру беразе Заходняй Дзвіны гарматы, прывезеныя на лодках па рацэ. Пасля адзінаццаці дзён аблогі уніяты завалодалі Бельчыцкім манастыром, і па загаду Я. Кунцэвіча манастырскія крэпасныя сцены былі знесены [7, с. 44]. Такім чынам, у выніку канфесійнага канфлікту старажытныя абарончыя ўмацаванні Бельчыцкай абіцелі былі ўшчэнт зруйнаваны, а праваслаўны манастыр зноў перайшоў пад уладу уніятаў.

Складаныя рэлігійныя і палітычныя падзеі, што адбываліся на Беларусі ў другой палове XVII ст., яскрава адлюстроўваліся на жыцці Бельчыцкай абіцелі і выклікалі новыя змены яе канфесійнай прыналежнасці. Так, з 1654 па 1667 гг. Барысаглебскі манастыр набыў статус праваслаўнага ў сувязі з захопам Полацка маскоўскім царом Аляксеем Міхайлавічам, які перадаў праваслаўнаму святарству ўсе абіцелі, што належылі езуітам пры С. Баторыі [5, с. 88].

У 1686 г. па Маскоўскай дамове паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай Полацк адышоў да апошняй, Бельчыцкі манастыр зноў апынуўся пад уладай уніятаў-бызыльянаў. Кіраванне абіцеллю ажыццяўлялі архімандрыты, якія прызначаліся прывілеямі караля Рэчы Паспалітай, ім перадавалася ў пажыццёвае валоданне ўся манастырская маёмасць. Менавіта ў гэты перыяд панавання уніятаў Барысаглебскі манастыр з'яўляўся самай багатай абіцеллю ў Полацкай епархіі [7, с. 45]. Па звестках «Годового дохода Полоцкой экономій въ 1725 г.», што паступаў у скарб Полацкага ваяводы, гарадскі прыбытак ад Бельчыцкай слабады і манастыра складаў амаль 1/3 частку падаткаў усяго мяшчанскага насельніцтва Полацка [5, с. 351]. Вялікая доля манастырскіх сродкаў у гарадскім бюджэце сведчыла аб добра развітай гаспадарчай дзейнасці уніятаў як на тэрыторыі абіцелі, так і ў прылеглых да яе вёсках і валасцях, якіх налічвалася 19 [13, с. 37]. Уніяцкія святары імкнуліся ўзняць не толькі эканамічны, але і культурна-рэлігійны ўзровень Барысаглебскага манастыра. Пры абіцелі ў XVIII - пачатку XIX ст. існавала невялікая бібліятэка царкоўна-багаслоўскай літаратуры (каля 100 паасобнікаў) і каштоўная галерэя абразоў XVI - XVII стст., сярод якіх былі выявы: Іаана Златавуста, Амвросія Медіаламскага, Грыгорыя Ніскага, Грыгорыя Багаслова, Васіля Вялікага, Іаана Дамаскіна і шматлікія іншыя [18, ф. 2617, воп. 1, спр. 192, а. 3].

За доўгую гісторыю існавання Полацкага Барысаглебскага манастыра неаднаразова змянялася палітычная, эканамічная і культурна-рэлігійная сітуацыя як на Полаччыне, так і на тэрыторыі Беларусі ўвогуле. Гэтыя змены адбываліся не толькі ў канфесійнай прыналежнасці абіцелі, яе духоўна-рэлігійнай дзейнасці, маёмасна-гаспадарчым стане, але і ў сістэме кіравання. Ад сана настаяцеля манастыра непасрэдна залежылі статус і роля абіцелі ў рэлігійным жыцці Полацка. Менавіта уніяцкія святары дамагліся існавання самастойнай Барысаглебскай архімандрыі і высокага звания яе настаяцеля - архімандрыта, які прызначаўся асабістым прывілеем караля Рэчы Паспалітай [13, с. 40].

Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі ў выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795 г.) часткова змянілася сістэма кіравання манастыром Барыса і Глеба: уніяцкія архімандрыты не прызначаліся прывілеямі манарха, а абіраліся асобнымі базыльянскімі кангрэгацыямі. Апошнім з архімандрытаў Бельчыцкай абіцелі, хто абіраўся такім чынам, быў Ісайя Шулякевіч (1794 - 1822 гг.), які займаў таксама і пасаду кіраўніка Полацкай епархіі. Пасля ягонай смерці сан архімандрыта быў ліквідаваны, манастыром пачалі кіраваць іераманахі. Паступовы заняпад Барысаглебскай абіцелі ў першай палове XIX ст. прывёў да страты самастойнасці яе кіравання. У 1834 г. па загаду уніяцкай калегіі абіцель перайшла пад уладу епіскапа Аршанскага і Мсціслаўскага [13, с. 39].

У 20 - 30-я гг. XIX ст. маёмасць і прыход Барысаглебскага манастыра значна скараціліся, гэта было звязана з палітыкай расійскай улады па пашырэнню ўплыву праваслаўнай царквы на тэрыторыі беларускіх губерняў. Прыход абіцелі складалі ў асноўным сяляне, жыхары трох прылеглых вёсак ( Бельчыцы, Шылкава, Кулакова) і невялікая колькасць полацкіх мяшчан [18, ф. 2617, воп. 1, спр. 192, а. 4].

Апошняя змена канфесійнай прыналежнасці Барысаглебскага манастыра адбылася 12 студзеня 1839 г., калі ў Полацку была ліквідавана Берасцейская царкоўная унія, і ўсе былыя уніяцкія храмы і абіцелі далучыліся да праваслаўя [5, с. 109]. З 1842 г. маёнткі Бельчыцкага манастыра разам з насельніцтвам у 600 сялянскіх душ паступілі ў казну, а сам ён быў «причислен в разряд заштатных»

[18, ф. 2502, воп. 1, спр. 2, а. 8]. Кіраванне абіцеллю спачатку ажыццяўлялі барысаглебскія іераманахі Інакенцій Блышцынскі (1842 - 1843 гг.) і Фауст Сабалеўскі (1843 - 1847 гг.), а з 1847 г. - протаіерэй полацкага Сафійскага сабора Андрэй Юркевіч [13, с. 41]. Так, некалі адна з магутнейшых абіцеляў страціла спачатку самастойнасць свайго кіравання, а потым і вялікія зямельныя ўладанні, прыбыткі з якіх доўгі час забяспечвалі існаванне насельнікам манастыра, рабілі яго багацейшым у Полацкай епархіі.

Узамен маёмасці, што адышла ў скарб, абіцелі было нададазена 60 дзесяцін зямлі, 8 штатных служкаў, а таксама пакінута за ёй Чарсцвяцкае возера ў Лепельскім павеце і млын на рацэ Бельчыцы. У 1852 г. да манастырскіх уладанняў было далучана яшчэ 90 дзесяцін зямлі і 300 дзесяцін лесу з ліку так званых «казённых дач» [13, с. 39]. Акрамя таго, з казны штогод выдаткоўвалася па 290 рублёў срэбрам на ўтрыманне духоўных асоб [13, с. 39]. Нягледзячы на значныя грашовыя выдаткі, да канца 50-х гадоў XIX ст. Барысаглебскі манастыр прыйшоў у стан глыбокага заняпаду, што тлумачыцца адсутнасцю ў абіцелі манахаў, якія б ажыццяўлялі царкоўнае служэнне і гаспадарчы нагляд.

На пачатку XIX ст. пры Бельчыцкім манастыры існавала праваслаўнае прыходскае вучылішча, дзе выхоўваліся бедныя дзеці духоўнага звання і дзеці мяшчан, але ў 1835 г., але калі манастыр перайшоў у кіраванне архірэя, навучальная ўстанова была зачынена [13, с. 41]. Тэта была апошняя спроба адраджэння былой духоўнай і культурна-асветніцкай дзейнасці ў абіцелі, якая паступова адышла на перыферыю рэлігійнага і грамадскага жыцця. Прычынай гэтаму былі як частыя змены канфесійнай прыналежнасці і кіравання ў папярэдні перыяд, так і геаграфічная аддаленасць манастыра ад гарадскога цэнтра, дзе ў XIX ст. адбываліся важнейшыя падзеі ўсіх сфераў жыцця і дзейнасці Полацка.

У другой палове XIX ст. манастыр Барыса і Глеба знаходзіўся ў вельмі складаным становішчы: патрабавалі рамонту старажытныя пабудовы храмаў, у абіцелі, практычна, адсутнічалі манахі-насельнікі, дрэнна вялася гаспадарка, амаль спынілася царкоўна-рэлігійная дзейнасць. З 16 жніўня 1863 г. Бельчыцкі «заштатный» манастыр перайшоў у кіраванне настаяцеля Полацкай Богаяўленскай абіцелі [18, ф. 2904, воп. 1, спр. 1, а. 5]. У 1864 г. прычт манастыра Барыса і Глеба складалі толькі тры духоўныя асобы, да канца 60-х гадоў XIX ст. у сцянах абіцелі жыхароў увогуле не засталося [18, ф. 2904, воп. 1, спр. 1, а. 3 - 5].

На працягу доўгага часу ў манастырскіх цэрквах не праводзіліся рамонтныя работы, а ў сувязі са складанымі падзеямі гісторыі Беларусі на пачатку XX ст. Барысаглебская абіцель апынулася ў стане поўнага забыцця. Пасля ўсталявання Савецкай улады ўвагу на Бельчыцкі храмавы комплекс упершыню звярнулі члены Полацкай павятовай камісіі па ахове помнікаў старажытнасці і мастацтва. Камісія была накіравана ў Барысаглебскую абіцель для дакладнага вызначэння стану манастырскіх цэркваў і вырашэння пытання аб пераносе складоў вайсковай часці, што размяшчаліся ў старажытных будынках храмаў у 1919 - 1920 гг. [14, ф. 54, воп. 1, спр. 343, а. 24 - 25]. Член павятовай камісіі К.Ф. Берг у сваёй справаздачы па выніках агляду Бельчыцкай абіцелі адзначаў, што царква Параскевіі Пятніцы працягвала разбурацца. Рэшткі яе драўлянага іканастаса, дах і купал разбіраліся на паліва мясцовымі жыхарамі. Барысаглебскі храм таксама знаходзіўся ў дранным стане: адна з яго сцен была наскрозь прабіта снарадам, падчас абстрэлу палякамі, ва ўсіх вокнах адсутнічала шкло. Акрамя таго, у будынку царквы размяшчаліся зброевыя склады 485 полацкага пяхотнага палка, што стварала магчымую пагрозу выбуху [14, ф. 54, воп. 1, спр. 343, а. 25 - 26].

Пасля паступлення справаздачы К.Ф. Берга аб стане Барысаглебскага манастыра ў Полацкі акруговы выканкам у 1920 г. значных мерапрыемстваў па захаванню храмаў ад разбурэння праведзена не было. Толькі 2 красавіка 1925 г. члены Полацкага таварыства краязнаўства на чале з І.П. Дэйнісам, для якіх быў неабыякавы лёс старажытнай Святыні, зрабілі новы захад па выратаванню бельчыцкіх храмаў. Члены таварыства краязнаўства правялі дэтальны агляд тэрыторыі абіцелі і выявілі, што мясцовыя жыхары прымаюць актыўны ўдзел у знішчэнні храмаў: разбіраюць са старажытных пабудоў цэглу, бутавы камень, драўляныя часткі купала, падлогі, аконныя шыбы [14, ф. 104, воп. 1, спр. 42а, а. 103].

14 красавіка 1925 г. прадстаўнікі таварыства краязнаўства ў складзе: археолага І.П. Дэйніса, выкладчыкаў гісторыі і беларусазнаўства Полацкага педтэхнікума Ф. Вышамскага і І. Трубача перадалі ў Полацкі акруговы выканкам акт агляду стану старажытнага помніка архітэктуры - Барысаглебскага манастыра, у якім пазначалася, што каштоўнейшы храмавы комплекс паступова разбураўся. Барысаглебская царква ў 1925 г. уяўляла сабою толькі чатыры моцна пашкоджаных сцяны, трываласць яе старажытнай муроўкі і непрыдатнасць цэглы для паўторнага будаўніцтва часова затрымалі разбурэнне. Купал і дах храма былі зняты, знішчаны алтарная апсіда, прытвор, падлога і аконныя рамы. Ад Пятніцкай царквы захоўваліся дзве паралельна размешчаныя каменныя сцяны, прастора між якімі была цалкам запоўнена цагляным ломам і смеццем. У разбураным стане знаходзіліся падхрамавыя скляпенні, дах, званіца і ўсе драўляныя часткі будынка. Падмурак трэцяга старажытнага храма (Вялікага безыменнага сабора) быў часткова схаваны пад пластамі глебы. У канцы 20-х гадоў XX ст. тэрыторыя былой Бельчыцкай абіцелі пачала паступова забудоўвацца мясцовымі жыхарамі [14, ф. 104, воп. 1, спр. 42а, а. 103].

Разам з прадстаўленнем актаў аглядаў члены краязнаўчага таварыства на працягу 20 - 30-х гадоў. неаднаразова накіроўвалі ў Полацкі акруговы выканкам заявы аб неабходнасці як мага хутчэйшага выра-

тавання старажытных храмаў: аб забароне разбору з іх плінфы і цэглы, а таксама забудовы тэрыторыі архітэктурнага помніка [14, ф. 104, воп. 1, спр. 42а, а. 102]. Далейшы лёс манастырскіх храмаў паказаў, што з боку гарадскога кіраўніцтва ніякіх мераў прынята не было. Тэта тлумачыцца ў першую чаргу атэістычнай палітыкай Савецкай улады, для якой храмы не прадстаўлялі мастацкай ці культурна-гістарычнай каштоўнасці, а таму падлягалі знішчэнню.

Трэба адзначыць, што яшчэ да ўсталявання бальшавіцкага кіраўніцтва Барысаглебскі манастыр знаходзіўся ў становішчы блізкім да разбурэння. Намаганні па рэстаўрацыі помніка ў 1909 - 1910 гг. прыкладаў член Віцебскай вучонай архіўнай камісіі І.І. Даўгоў, які добра ведаў полацкія старажытнасці. У яго планах было прыцягненне да археалагічных даследаванняў абіцелі навучэнцаў Полацкага кадэцкага корпуса, але гэтыя задумы не былі здейснены па прычыне смерці І.І. Даўгова ў 1911 г. [20, с. 10]. Да пачатку 20-х гадоў XX ст. ніякіх работ па адраджэнню ці захаванню культавых пабудоў манастыра не праводзілася.

Толькі ў 50-я гады XX ст., дзякуючы намаганням кіраўніка Полацкага краязнаўчага таварыства І.П. Дэйніса, плошча манастыра была аб'яўлена запаветнай, вакол яе тэрыторыі былі пастаўлены слупы з надпісамі аб забароне тут усялякіх раскопак ці будаўніцтва. Аднак з гэтым мала хто лічыўся, мясцовыя жыхары выкопвалі бутавы камень і займалі тэрыторыю старажытнага манастыра пад агароды і гаспадарчыя пабудовы [14, ф. 1164, воп. 5, спр. 11, а. 53].

Да пачатку 60-х гадоў XX ст. найкаштоўнейшы Бельчыцкі комплекс помнікаў культавага дойлідства XII ст. быў канчаткова страчаны. На месцы былога існавання Барысаглебскай царквы і храма Св. ГІараскевіі Пятніцы - узораў самабытнай Полацкай школы дойлідства XII - XIII стст. - былі ўзведзены тыповыя пяціпавярховыя жылыя будынкі [3, с. 183]. Праз падмуркі Вялікага (безыменнага) сабора і храма-трыконха (унікальны прыклад балканскай традыцыі храмавага дойлідства і манументальнага жывапісу на Полацкай зямлі) прайшла шашэйная дарога [21, с. 103].

Апошняе дзесяцігоддзе XX ст. адкрыла новую старонку ў рэлігійным жыцці Беларусь Царква атрымала магчымасць адраджэння традыцый хрысціянскай духоўнасці, маральнасці, што былі знішчаны ў гады камуністычнай эпохі. А гэта тое, што забяспечвае ўключэнне асобы ў працэс грамадскай, творча-стваральнай дзейнасці, злучае яе з усім чалавечым родам, нацыянальнай і сусветнай культурай, сучасным, мінулым і будучым. Людзі пацягнуліся да храму. Даследаванні па праблеме рэлігійнасці і рэлігійных адносін, якія праводзіліся Інстытутам сацыялогіі АН Беларусі з пачатку 90-х гадоў, выявілі, што роля і месца царквы ў грамадскім жыцці значна ўзрасла. Так, па выніках апытанняў 1994 г. - 32,8 % апытанага насельніцтва з'яўляліся веруючымі; у 1997 г. - 49,5 %, прычым 77,4 % апытаных адносілі ся.бе да праваслаўнай канфесіі [22, с. 30].

Па выніках сучасных даследаванняў, ёсць усе падставы выказаць меркаванне, што тэндэнцыя павелічэння колькасці веруючых на Беларусі, якая была характэрна для 90-х гадоў, працягваецца. Так, на 2001 г. колькасць вернікаў сярод апытаных склала 56,4 % [23, с. 112].

Адраджэнню традыцый духоўнасці садзейнічае павелічэнне колькасці храмаў - сімвалаў праваслаўя. За 1998 - 2000 гг. на Беларусі было пабудавана больш за 180 цэркваў, сёння каля 100 знаходзяцца ў стадыі ўзвядзення [24, с. 95].

Рост цікавасці з боку духоўнай і свецкай улад да царкоўна-гістарычнай і архітэктурнай спадчыны Полацка, павелічэнне колькасці вернікаў, выклікала ўвагу да страчанага Барасаглебскага манастыра. Дзякуючы намаганням прыхажанаў полацкай уніяцкай парафіі на пачатку 90-х гадоў у раёне вёскі Кароўнікі, што непадалёк ад старажытнага месца размяшчэння манастыра, была пабудавана драўляная царква ў імя Св. Параскевіі Пятніцы. Прыхажане спадзяюцца на будучае ўзнаўленне Барысаглебскай абіцелі [25, с. 3].

## ЛІТАРАТУРА


1. Тихомиров М.Н. Древнерусские города. - М., 1956. - 417 с.
2. Тарасаў С.В. Полацк IX - XVII стст.: Псторыя і тапаграфія. - Мн.: Беларуская навука, 2001. - 183 с.
3. Хозеров И.М. Полоцкое зодчество XI - XII веков в свете новых исследований // Адраджэнне: Пет. альманах. Вып. 1 / Склад, і навук. рэд. А.П. Грыцкевіч. - Мн.: Універсітэцкае, 1995. - 259 t.
4. Археалогія і нумізматыка Беларусь Энцыкл. / Бел. энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. - Мн.: БелЭн, 1993, - 702 с.
5. Без-Корнилович М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии. - СПб.: Типография III отд. Собственной Е. И. В. канцелярии, 1855. - 355 с.
6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусь У 6 т. Т. 2 / Бел. энцыкл.; Рэдкал.: Б.І. Сачанка і інш. - Мн.: БелЭн, 1994.- 537 с. Т. 5. М-Пуд/Бел. энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. - Мн.: БелЭн, 1999. - 592 с.
7. Сементовский А. Полоцкий Борисоглебский монастырь // Полоцкий летописец. Историко-литературный журнал. - 1992. - № 1. - С. 42 - 47.

8. Воронин Н.Н. Бельчицкие руины // Архитектурное наследство. - 1956. - № 6. - С. 3 - 20.
9. Сапунов А. Река Западная Двина: Историко-географический обзор. - Витебск, 1893. - 612 с.
10. Данилевич В.Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия. - Киев, 1896. - 260 с.
11. Загарульскі Э.М. Заходняя Русь: IX - XIII стст. - Мн.: Універсітэцкае, 1998. - 240 с.
12. Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли (IX - XIII вв.) - Мн.: Наука и техника, 1978. - 160 с.
13. Говорский К. Историческое описание Полоцкого Борисоглебского монастыря // Полоцкий летописец. Историко-литературный журнал. - 1992. - № 1. - С. 37 - 42.
14. Установа «Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку». Ф. 51, воп. 1, спр. 115, 116; ф. 54, воп. 1, спр. 343; ф. 104, воп. 1, спр. 42а; ф. 1164, воп. 1, спр. 11; воп. 5, спр. 11.
15. Селицкий А.А. Живопись Полоцкой земли XI-XII вв.-Мн.: Навука і тэхніка, 1992 - 173 с..
16. Полоцкие грамоты XIII - начала XVI в.: В 4 т. / Сост. А.Л. Хорошкевич. Т. 1. - М., 1977. - 228 с.; Т.3.-М., 1980.-213 с.; Т. 4.-М., 1982.-218 с.
17. Полоцкая ревизия 1552 г. / К изд. подг. И.А. Лаппо. Издание Императорского Общества истории и древности российских при Московском университете. - М.: Университетская типография, 1905. - 236 с.
18. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (НГАБ). Ф. 1416, воп. 6, спр. 886; ф. 2502, воп. 1, спр. 2; ф. 2617, воп. 1, спр. 192; ф. 2904, воп. 1, спр. 1.
19. Беляев Н. История Полотска или Северо-западной Руси от древнейших времён до Люблинской унии. - М.: Синодальная типография, 1872. - 286 с.
20. Полоцко-Витебская старина / Издание Витебской учёной Архивной комиссии. - 1911. - Кн. 1. - С. 10-12.
21. Воронин Н.Н. К истории полоцкого зодчества XII в. // Краткие сообщения Института археологии АН СССР. - 1962. - Вып. 87. - С. 102 - 104.
22. Новикова Л.Г. Религиозный бум в Белоруссии: миф или реальность // Социология. - 1999. - № 2. - С. 29-36.
23. Шайкоў В.І. Духоўнасць як імператыў свабоды і творчасці асобы: Гісторыка-сацыялагічны аспект // Асветніцтва і гуманістычныя каштоўнасці Беларусі ў рэтраспектыве часу (да 900-годдзя з дня нараджэння Ефрасінні Полацкай): Матэрыялы міжнар. навук. канф., Наваполацк, 30-31 мая 2002. - Мн.: Дэполіс, 2002. - С. 104 - 113.
24. Навіцкі У.І. Сучаснае праваслаўе ў Беларусі адраджэнне традыцый духоўнасці // Асветніцтва і гуманістычныя каштоўнасці Беларусі ў рэтраспектыве часу (да 900-годдзя з дня нараджэння Ефрасінні Полацкай ): Матэрыялы міжнар. навук. канф., Наваполацк, 30-31 мая 2002 г. - Мн.: Дэполіс, 2002.-С. 94- 103.
25. Анціпаў К. Старажытныя храмы Полацка // Полацкі веснік. - 1998. - 15 верасня.